








# СКЛАДАНЫ СКАЗ

# ПЫТАННІ:



1. Складаны сказ. Фармальная, семантычная і камунікатыўная арганізацыя складанага сказа.
2. Класіфікацыя складаных сказаў.



Ты ўгору цягнуўся, а дрэвы перараслі цябе (*Р.Барадулін*).

Цішыня, і першы-першы шум жывога лесу азваўся мне (*У. Караткевіч*)

У чорнае паднябессе ўзляцела ракета — пачуўся ўзрыў (*В.Быкаў*)

[1]Ты ўгору цягнуўся, а [2]дрэвы перараслі цябе (*Р.Барадулін*).

[[1] ], а [[2] ].

[1]Цішыня, і [2]першы-першы шум жывога лесу азваўся мне (*У. Караткевіч*)

[[1] ], і [[2] ].

[1]У чорнае паднябессе ўзляцела ракета — [2]пачуўся ўзрыў (*В.Быкаў*)

[[1] ] — [[2] ].



# СКЛАДАНЫМ

называецца сказ, у які ўваходдзяць дзве ці некалькі прэдыкатыўных частак, аб'яднаных у адно структурна-сінтаксічнае і сэнсавае цэлае.

Кожная прэдыкатыўная частка складанага сказа сваёй структурай і сэнсам нагадвае просты сказ (двухсастаўны ці аднасастаўны, развіты ці неразвіты, ускладнены ці няўскладнены).





**<u>Адрозненне складанага сказа ад простага:</u>**

1) у простым сказе адна прэдыкатыўная частка, у складаных — дзве і больш;

2) просты сказ утвараецца са слоў і словазлучэнняў, а складаны — з простых сказаў, якія губляюць сваю сэнсавую самастойнасць і з'яўляюцца ўзаемадапаўняльнымі.

Катэгорыя прэдыкатыўнасці рэалізуецца ў частцы складанага сказа такім жа спосабам, як і ў простых сказах. Але разам з гэтым яны істотна адрозніваюцца ад простых сказаў, таму што не маюць граматычнай, сэнсавай і інтанацыйнай самастойнасці і заўсёды функцыянуюць у цесным адзінстве, дзе ўзаемна абумоўлены і адна без другой не ўжываюцца. Такія прэдыкатыўныя адзінкі носяць назву **састаўных** або **прэдыкатыўных частак складанага сказа**.





Ф а р м а л ь н а я арганізацыя складанага сказа рэалізуецца яго структурнай схемай.

Структурная схема складанага сказа ўключае ў сябе:

- характарыстыку будовы прэдыкатыўных частак;
- від сінтаксічнай сувязі паміж імі;
- сродкі выражэння сінтаксічнай сувязі.

**Структурная схема складанага сказа лічыцца яго граматычнай ф о р м а й.**

[ ] — галоўная прэдыкатыўная частка;

( ) — даданая (залежная) частка;

 — накірунак пытання ад галоўнай часткі да даданай;

 — падпарадкавальны злучнік;

 — злучальнае слова;



— злучальны злучнік;



[ x ] — пытанне ставіцца ад слова;

[ x- ] — пытанне ставіцца ад словазлучэння;

[ -x- ] — пытанне ставіцца ад усяго сказа.

Кожны складаны сказ мае сваю семантычную арганізацыю, свой інфармацыйны змест. Гэты змест складваецца з сукупнасці зместу, увасобленага ў прэдыкатыўных частках, і таго дадатковага сэнсу, які ўзнікае ў выніку ўзаемадзеяння гэтых частак.



Напрыклад:

*Шуміць вецер, і ідзе дождж .*

- паведамляецца пра дзеянні і іх утваральнікаў,
- паказваюцца адносіны адначасовасці паміж прэдыкатыўнымі часткамі.

Адносіны паміж прэдыкатыўнымі часткамі складанага сказа могуць быць разнастайныя:

- супастаўляльныя,
- размеркавальныя,
- часавыя,
- прычынныя,
- умоўныя,
- уступальныя і інш.



Гэтыя адносіны маюць абагульнены характар і лічацца **граматычным значэннем складанага сказа.**

**Камунікатыўная арганізацыя складанага сказа** адметная тым, што ён заўсёды афармляецца як адна камунікатыўная адзінка. Асабліва важную ролю ў афармленні камунікатыўнай цэласнасці складанага сказа адыгрываюць <u>інтанацыя</u> і <u>парадак слоў</u>.



Прэдыкатыўныя часткі не маюць закончанай інтанацыі, бо такой інтанацыяй валодае ўвесь складаны сказ.

Парадак слоў у адной прэдыкатыўнай частцы звычайна залежыць ад парадку слоў у другой і тых адносін, у якія ўступаюць гэтыя часткі ў складаным сказе.



Для складанага сказа важны таксама і парадак размяшчэння саміх прэдыкатыўных частак.

Парадак гэты (асабліва калі ён не фіксаваны) вызначаецца моўнай сітуацыяй або камунікатыўным заданнем складанага сказа і выражае яго актуальнае чляненне, пры якім актуальна больш значная частка звычайна займае пазіцыю



пасля актуальна менш значнай часткі.

*Разумны той, хто сам сябе не хваліць.*

*тэма* *рэма*

*актуальнае чляненне ≠ граматычнае чляненне*



*Хто сам сябе не хваліць, той разумны.*

*тэма* *рэма*

*актуальнае чляненне = граматычнае чляненне*

*Той, хто сам сябе не хваліць, разумны.*

*тэма* *рэма*

*актуальнае чляненне ≠ граматычнае чляненне*

Такім чынам, фармальная, семантычная і камунікатыўная арганізацыя складанага сказа сумесна характарызуюць яго як шматаспектную сінтаксічную адзінку.





Агульная класіфікацыя складаных сказаў грунтуецца на аснове адзінства формы сінтаксічнай сувязі прэдыкатыўных частак і характару семантыка-сінтаксічных адносін паміж імі.

# Віды сувязі паміж структурнымі часткамі складанага сказа



| Від сувязі | Спосаб сувязі | Прыклады схем |
|---|---|---|
| а) злучальная (часткі сказа раўнапраўныя) | злучальныя злучнікі (спалучальныя, супраціўныя, размеркавальныя) | [1 ], [і] [2 ].<br>*1Грыміць гром, і 2бліскае маланка.* |
| б) падпарадкавальная (часткі сказа нераўнапраўныя) | падпарадкавальныя злучнікі і злучальныя словы сувязь | якая?<br>[1 х], (2 (што) ).<br>*1Бліскае такая маланка, што 2страшна робіцца.* |
| в) бяззлучнікавая | інтанацыйная | [1 ], [2 ].<br>*1Грыміць гром, 2бліскае маланка.* |



У залежнасці ад віду сувязі паміж структурнымі часткамі складаныя сказы падзяляюцца на:

- **злучнікавыя (складаназлучаныя і складаназалежныя) сказы**: *Па небе праплыла хмурынка, і па полі прабегла пасмачка ценю.* — *Па небе праплыла хмурынка, ад якой па полі прабегла пасмачка ценю;*



- **бяззлучнікавыя сказы:** *Па небе праплыла хмурынка — па полі прабегла пасмачка ценю;*
- **сказы камбінаванай будовы, або сказы з рознымі відамі сувязі:** *Сонца ўжо схавалася, непрыкметна знікла зара, а ўсё яшчэ даволі светла.*

У залежнасці ад характару злучнікаў або злучальных слоў і афармленых імі адносін паміж прэдыкатыўнымі часткамі сярод злучнікавых складаных сказаў выдзяляюцца:

- складаназлучаныя: *Дарог у свеце вельмі многа, а ты між іх сваю знайдзі;*
- складаназалежныя: *Дзе сосны нядаўна шумелі, там светлыя вуліцы скрозь.*



У залежнасці ад характару адносін паміж прэдыкатыўнымі часткамі бяззлучнікавыя складаныя сказы падзяляюцца на:

- сказы з аднатыпнымі часткамі: *Цвітуць сады над рэчкаю, красуе ў кветках май; Дагарэла зара ў небакраі, на зямлю ноч спакойна лягла ;*
- сказы з разнатыпнымі часткамі: *Мы знаем: у нашай краіне няма непрыгожай зямлі; Дзень сягоння ў хаце шчаслівы — дарагія прыехалі госці.*





Некаторыя злучнікавыя складаныя сказы сумяшчаюць у сабе адзнакі складаназлучаных і складаназалежных сказаў: *На дварэ было яшчэ відно, тады як у хаце ўжо цёмна. Хоць неба пакрылася хмарамі, але дажджу не было*.

Такія сказы лічацца складанымі сказамі **прамежкавага, або пераходнага тыпу.**

# ДЗЯКУЮ ЗА ЎВАГУ!

